УДК 27-9=161.3(476)

*І.М. Мароз*

## СТАРААБРАДНІЦТВА БАБРУЙСКАЙ ВОБЛАСЦІ (1944–1954 гг.)

У артыкуле разглядаецца месца стараабраднікаў сярод іншых рэлігійных культаў Бабруйшчыны. Абгрунтоўваецца неабходнасць далейшага вывучэння пазначанай тэмы. На аснове раней неапублікаванага архіўнага матэрыяла аўтарам складзены табліцы, якія змяшчаюць статыстычны матэрыял па абшчынах. Выдзяляюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця сеткі старабрадніцкіх цэнтраў Бабруйскай вобласці.

### Уводзіны

Стараабраднікі складаюць спецыфічную і малавывучаную группу беларускага насельніцтва. Вывучэнне гісторыі стараабрадніцтва як складніка гісторыі РПЦ на тэрыторыі Беларусі паччынаецца ў канцы 1950-х – пачатку 1960-х гг. з пачаткам канкрэтна-сацыялагічным даследваннем рэлігій СССР [3, с. 6]. Але толькі на мяжы XX і XXI стагоддзяў з'явіліся даследванні па гісторыі стараабрадніцва ўласна беларускіх тэрыторый. Да асноўных даследаванняў можна аднесці калектыўныя працы «Старообрядчество в Белорусии» Т.П. Кароткай, К.С. Пракошынай, А.А. Чуднікавай, «Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XXстст.)» пад агульнай рэдакцыяй У.І. Навіцкага і спецыялізаваную манаграфію А.А. Гарбацкага «Страраабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX стагоддзя» [14; 13; 2]. Асаблівасцю ўсіх вышэй згаданых прац з'яўляецца агляд стараабрадніцкай гісторыі толькі да пачатку XX ст. і выбарачны зварот да сучаснасці праз выкарыстанне этнаграфічнага матэрыяла.

У той жа час у сучаснай беларускай гістарычнай навуке не існуе даследаванняў, прысвечанных гісторыі стараабраднікаў XX і тым больш XXI стст. Толькі ў апошнія некалькі гадоў з'яўляюцца артыкулы па асобных галінах гісторыі стараабрадніцва першай паловы XX ст. Да такіх адносяцца артыкул А.М. Вабішчэвіча «Грамадска-культурная і рэлігійна-асветніцкая дзейнасць русскіх стараабраднікаў у Польшчы ў 1920-я – 1930-я гады» і артыкул С.А. Пасталоўскага «Повседневная жизнь старообрядцев в Беларуси в 1920-е – 1930-е гг.» [1; 16].

Гэты артыкул з'яўляецца спробай акрэсліць становішча і паказць месца стараабраднікаў на тэрыторыі Бабруйскай вобласці. Крыніцазнаўчай асновай работы сталі дакументальныя матэрыялы з архіўных фондаў Занальнага Дзяржаўнага архіва г. Бабруйска і Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці.

### Месца стараабраднікаў сярод іншых рэлігійных культаў Бабруйшчыны

Бабруйская вобласць была ўтворана 20 верасня 1944 г. з раёнаў Магілёўскай, Мінскай, Палескай абласцей [15, с. 25] і складалася з 14 раёнаў (Акцябрскі, Асіповіцкі, Бабруйскі, Глускі, Грэскі, Капыльскі, Кіраўскі, Клічаўскі, Любаньскі, Парыцкі, Слуцкі, Старадарожскі, Старобінскі, Чырвонаслабодскі). У трох раёнах (Бабруйскі, Кіраўскі, Парыцкі) вобласці кампакта пражывала стараабрадніцкае насельніцтва Беларусі [5, л. 3]. Першыя стараабраднікі засялялі Бабруйшчыну ў два этапы: ў 1735 і ў 1765 гг. Такім чынам з'яўляюцца чыста стараабрадніцкія паселішчы: Капусціна слабада, вёскі Туркі і Салоціна [2, с. 76]. Менавіта гэтыя пасяленні і застаюцца рэгіянальнымі цэнтрамі стараабрадніцтва Бабруйскай вобласці. На канец 1945 г. у межах Бабруйскай вобласці агулам налічвалася 23 рэлігійныя супольнасці, што складала прыблізна 4 055 чалавек [5, л. 2]. З іх стараабрадніцкіх было 13 супольнасцей з колькасцю чальцоў 3 425 чалавек [5, л. 2].

---

Навуковы кіраўнік – А.А. Гарбацкі, доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры славянскіх народаў Брэсцкага Дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна

Гэта складала 56,5% ад агульнай колькасці дзеючых рэлігійных супольнасцей[1] і 84,5% ад афіцыйна падлічанай колькасці чальцоў гэтых супольнасцей. Вынікае, што праз год пасля стварэння Бабруйскай вобласці стараабраднікі складалі большасць сярод т.зв. прыхільнікаў рэлігійных культаў. Да апошніх адносіліся ўсе дзеючыя на тэрыторыі СССР канфесіі, акрамя РПЦ. Трэба зазначыць, што толькі 4 з 13 груп стараабраднікаў Бабруйскай вобласці ў канцы 1945 г. былі зарэгістраваныя. Упаўнаважаны Савета па справах рэлігійных культаў Кулічкоў адзначае, што «все эти сообщества ...о регистрации своих религиозных обществ ходатайств не подают и по существу уклоняются от регистрации» [5, л. 3]. З табліцы 1 бачна, што хадайніцтваў на рэгістрацыю рэлігійных супольнасцей паступала дастаткова мала. Пры гэтым і працэнт адказаў у рэгістрацыі быў вельмі высокі, што, у сваю чаргу, было адной з прычынаў малой колькасці хадайніцтваў. З-за адсутнасці дадзеных па колькасці хадайніцтваў за 1948–1951 гг. і непаўнаты дадзеных па 1945–1947, 1952–1953 гг. немагчыма даць поўную ацэнку сітуацыі.

Табліца 1 – Хадатайніцтвы стараабраднікаў аб рэгістраванні рэлігійных абшчынаў

| Год | Пададзена ўсяго | Задаволена | Не задаволена | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | Адмоўлена | Не разгледжана | Вернута |
| 1945 | – | – | – | 1 | – |
| 1946 | 8 | – | 1 | – | 3 |
| 1947 | – | – | – | 2 | 1 |
| 1952 | не паступала | – | – | – | – |
| 1953 | 1 | – | 1 | – | – |

*Заўвага – складзена аўтарам*

**Тэндэнцыі развіцця сеткі стараабрадніцкіх цэнтраў**

Да пачатку 1950-х гг. на тэрыторыі Бабруйскай вобласці ішоў працэс «стабілізацыі», упарадкавання цэнтраў старабрадніцтва. Праз аб’яднанне геаграфічна блізкіх рэлігійных супольнасцей вакол зарэгістраваных стараабрадніцкіх абшчынаў фарміраваліся пэўныя мясцовыя цэнтры. Так, у 1945 г. «по целесообразности» рэлігійная супольнасць в. Скрыпліца прымацоўвалася да рэлігійнай супольнасці в. Капусціна Кіраўскага раёна [5, л. 2]. У 1946 г. стараабрадніцкая супольнасць в. Зарэчча зліта з супольнасцю в. Нова-Александраўкі Парыцкага раёна з-за таго, што «это общество находится в 4–5 километрах от зарегистрированного религиозного общества одного и того же культа» [6, л. 2]. У тым жа годзе рэлігійная супольнасць пасёлка Лекерта Бабруйскага раёна далучана да зарэгістраванай царквы г. Бабруйска [6, л. 2адв.]. Але таксама былі аб’яднаны дзве абшчыны горада Бабруйска: абшчына па вул. Камбінатарскай далучана да супольнасці па вул. Пушкінскай [6, л. 2]. Вернікі в. Салоціна Парыцкага раёна атрымалі магчымасць самім абріць, да якой царквы прыяднацца; у выніку адбылося іх аб’яднанне з рэлігійнай абшчынай в. Туркоўская Слабада Бабруйскага раёна [6, л. 2]. Акрамя зарэгістраваных, у 1947 г. ў Бабруйскай вобласці існавалі незарэгістраваныя, але дзеючыя старабрадніцкія супольнасці. Такімі абшчынамі былі старабрадніцкія супольнасці в. Новая Шараёўшчына і в. Стасеўка Бабруйскага раёна, в. Завічча Парыцкага раёна [7, л. 15]. Некалькі абшчынаў чакалі на задаваленне хадайніцтваў, напрыклад, супольнасці ў в. Багушоўка і в. Вуглы Бабруйскага раёна, абшчына г. Бабруйска [7, л. 13].

[1] У 1944–1965 гг. пры Урадзе СССР існавалі два асобныя дзяржаўныя органы, якія займаліся пытаннямі рэлігіі: Савет па справах РПЦ і Савет па справах рэлігійных культаў. У кампетэнцыю апошняга ўваходзілі стараабраднікі.

З 1951 г., як вынікае з Інфармацыйных справаздачаў упаўнаважаннага па справах рэлігійных культаў за 1951–1953 гг., можна гаварыць аб устанаўленні пэўнай сістэмнасці і ўпарадкаванасці сеткі вядомых старабрадніцкіх абшчынаў у Бабруйскай вобласці [8, л. 1, 8, 15; 9, л. 12, 21; 10, л. 1, 10]. Па стане на 1 студзеня 1953 г. па вобласці налічваліся зарэгістраваныя рэлігійныя стараабрадніцкія супольнасці: г. Бабруйск – 1; Бабруйскі раён – 4 (вёскі Багушоўка, Баранавічы, Туркоўская слабада, Вуглы); Парыцкі раён – 2 (вёскі Нова-Александраўка, Зарэчча); Кіраўскі раён – 1 (в. Капусціна) [10, л. 1]. Былі таксама незарэгістраваныя, але дзеючыя явачным парадкам: Кіраўскі раён – 1 (в. Скрыпліца) [9, л. 3], Парыцкі раён – 1 (в. Завічча, разам з вёскамі Дражно і Малімоны) [9, л. 16; 10, л. 10]. У 1951–1953 гг. у справаздачах упаўнаважаных па справах рэлігійных культаў па Бабруйскай вобласці змешчаны разгорнутыя звесткі аб некаторых стараабрадніцкіх абшчынах (г. Бабруск, вёскі Багушоўка, Капусціна, Зарэчча, Скрыпліца). Аднак большасць звестак аб рэлігійных супольнасцях пададзена ў справаздачах фрагментарна, адрывіста, таму складана аб’яднаць дадзеныя па ўсіх старабрадніцкіх абшчынах ў пэўную сістэму (табліца 2).

Табліца 2 – Абшчыны стараабраднікаў па Бабруйскай вобласці

| Месцазнаходжанне маліtвеннага дома | Дата рэгістрацыі | Духоўны настаўнік | Гаспадар будынка малітвенага дома |
|---|---|---|---|
| г. Бабруйск [8, л. 19; 9, л. 18; 4, л. 2] | 27.08.1947 | Маслаў Якаў Владэнтавіч / Пётр Владэнтавіч** | Нацыяналізаванае |
| в. Багушоўка Бабруйскага р-на [9, л. 19; 4, л. 2] | 5.06.1947 | Андрэеў Павал Рыгоравіч | Нацыяналізаванае |
| в. Туркі (Туркоўская слабада) Бабруйскага р-на [9, л. 18; 4, л. 2] | 16.09.1946 | Фядулаў Васілій Аляксеявіч | Нацыяналізаванае |
| в. Вуглы Бабруйскага р-на [9, л. 19; 4, л. 2] | 30.03.1948 | Казлоў Ерымей Трафімавіч | Нацыяналізаванае |
| в. Баранавічы Бабруйскага р-на [9, л.19; 4, л. 2] | 29.09.1946 | Іваноў Стэфан Зіноўевіч | Нацыяналізаванае |
| в. Капусціна Кіраўскага р-на [9, л. 19; 10, л. 1; 4, л. 2] | 27.09.1946 | Чыстабаеў Клім Пятровіч | Нацыяналізаванае |
| в. Скрыпліца Кіраўскага р-на [10, л. 3] | Не зарэгістравана | Кушнераў Дзмітрый | Невядома |
| в. Зарэчча Парыцкага р-на [9, л. 19; 10, л. 12, 13] | 1947 | Ляшкоў Ягор Яфімавіч | Арандавана ў прыватнай асобы (гр. Папова) |
| в. Нова-Аляксандраўка Парыцкага р-на [9, л. 19] | Невядома | Кудаленка Іван Ерымеевіч | Нацыяналізаванае |
| в. Завічча Парыцкага р-на [9, л. 16; 10, л. 10] | Не зарэгістравана | А.І. Маркаў (1952 г.) Е.В. Кляйноў (1953 г.) | Невядома |

*Заўвага – складзена аўтарам*

**Па стане на 1.09.1952 г. Якаў В. Маслаў, а на 05.1954 г. – Пётр В. Маслаў; дакладная дата змены духоўнага настаўніка невядома.

Аналізуючы вышэйпададзеныя статыстычныя звесткі, можна сцвярджаць, што большасць вядомых упаўнаважанаму Савета па справах рэлігійных культаў старабрадніцкіх супольнасцяў Бабруйскай вобласці да 1953 г. былі сістэматызаваны:

1) выяўлены незарэгістраваныя супольнасці;

2) адзначана колькаснае павялічэнне першых зарэгіставаных супольнасцей праз аб'яднанне з незарэгістраванымі;

3) па большасці абшчын прадстаўлены пэўныя статыстычныя дадзеныя.

Зазначым, што рэгістрацыя асноўных рэлігійных абшчынаў праходзіла ў 1946–1948 гг., а за 1949–1953 гг. не было зарэгістравана ніводнай рэлігійнай стараабрадніцкай супольнасці. Паказальна, што большасць будынкаў малітоўных дамоў належала дзяржаве, але сустракаецца і факт арэнды будынка ў прыватнай асобы.

Зарэгістраваныя абшчыны выбарачна інспектаваліся дзяржорганамі пакваратальна пачынаючы з 1951 г. [8, л. 3, 8, 9, 19–21]. У планах работы правяраючых органаў на 1951–1954 гг. ужо часта фігуруе стараабрадніцкая тэматыка: плануюцца інспекцыі «путём выезда на место изучить практическую деятельность среди населения членов и актива зарегистрированной общины старообрядцев в д. Заречье» [11, л. 4]. У раздзелах справаздачаў, дзе апісваюцца вынікі такіх выездаў, падаецца інфармацыя аб малітоўным будынку, духоўным настаўніку, колькасці вернікаў па асобных гадах, прыводзяцца прыклады ўзаемаадносінаў як унутры стараабрадніцкай абшчыны, так і самой абшчыны з кіраўніцтвам школы і райвыканкама [8, л. 20, 21].

Быў складзены таксама план працы ўпаўнаважанага на першае паўгоддзе 1954 г., але неўзабаве Бабруйская вобласць была расфарміравана [12, л. 2]. У студзені 1954 г. «стараабрадніцкія» раёны скасаванай вобласці былі перададзены ў Гомельскую (Парыцкі) і Магілёўскую вобласці ( Бабруйскі, Кіраўскі) [15, с. 25].

**Заключэнне**

На пачатку існавання Бабруйскай вобласці стараабрадніцкая рэлігійная супольнасць складала колькасную большасць па ліку як дзеючых цэркваў, так і чальцоў абшчыны сярод іншых рэлігійных культаў рэгіёна. У цэлым становішча стараабрадніцкай царквы Бабруйскай вобласці характаразавалася наступным: 1) у 1946–1948 гг. адбываўся працэс рэгістрацыі асноўных стараабрадніцкіх абшчынаў; 2) да пачатку 1950-х гг. склалася сетка стараабрадніцкіх супольнасцяў праз далучэнне да зарэгістраваных абшчынаў незарэгістраваных; 3) на працягу 1951–1953 гг. узмацніўся кантроль над стараабрадніцкімі паселішчамі, што выразілася ў правядзенні перыядычнага інспектавання рэлігійных абшчынаў дзяржаўнымі органамі.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Вабішчэвіч, А.М. Грамадска-культурная і рэлігійна-асветніцкая дзейнасць рускіх стараабраднікаў у Польшчы ў 1920-я – 1930-я гады / А.М. Вабішчэвіч // Вес. Полацкага дзярж. ун-та. – 2008. – № 1. – С. 101–108.

2. Гарбацкі, А.А. Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX стст. / А.А. Гарбацкі. – Брэст : Выд-ва БрДУ імя А.С. Пушкіна, 1999. – 202 с.

3. Гарбацкі, А.А. Гісторыя стараабрадніцтва: вынікі крыніцазнаўчага вывучэння (1917 г. – пач. XXI ст.) / А.А. Гарбацкі // Вес. Брэсцкага ўн-та. Сер. гуманітарных і грамадскіх навук. – 2009. – № 1 (36). – С. 5–16.

4. Документы (отчеты, сведения, докладные записки) о работе уполномоченного Совета по делам религиозных культов за 1954 год // Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці (ДАМА). – Фонд. 2336. – Воп. 1. – Спр. 2.

5. Информационный отчет, статистическая сводка о молитвенных зданиях религиозных культов и сведения об открытии молитвенных зданий в IV квартале // Занальны дзяржаўны архіў у г. Бабруйску (ЗДАБ). – Фонд. 1129. – Воп. 1. – Спр. 2.

6. Информационный отчет за III квартал, сведения о количестве возбужденных ходатайств об открытии молитвенных зданий и статистическая сводка // ЗДАБ. – Фонд. 1129. – Воп. 1. – Спр. 5.

7. Информационные отчеты по кварталам, сведения о служителях религиозных культов и статистические сводки // ЗДАБ. – Фонд. 1129. – Воп. 1. – Спр. 8.

8. Информационные отчеты по кварталам Совету, республиканскому уполномоченному и докладная записка // ЗДАБ. – Фонд. 1129. – Воп. 1. – Спр. 10.

9. Информационные отчеты по кварталам Совету и республиканскому уполномоченному, докладная записка и сведения о молитвенных зданиях // ЗДАБ. – Фонд. 1129. – Воп. 1. – Спр. 12.

10. Информационные отчеты по кварталам и статистические сведения // ЗДАБ. – Фонд. 1129. – Воп. 1. – Спр. 14.

11. План работы на IV квартал 1951 г. и.о. уполномоченного Совета по делам религиозных культов по Бобруйской области // ЗДАБ. – Фонд. 1129. – Воп. 3. – Спр. 4.

12. План работы на 1-е полугодие 1954 г. уполномоченного Совета по делам религиозных культов по Бобруйской области // ЗДАБ. – Фонд. 1129. – Воп. 3. – Спр. 6.

13. Грыгор’ева, В.В. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX стст.) / В.В. Грыгор’ева [і інш.]; навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск : Экаперспектыва, 1998. – 340 с.

14. Короткая, Т.П. Старообрядчество в Белоруссии / Т.П. Короткая [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1992. – 117 с.

15. Памяць. Бабруйскі раён : гіст.-дак. хроніка / рэд.-склад. У.А. Салановіч. – Минск : БелЭн, 1998. – 605 с.

16. Посталовский, С.А. Повседневная жизнь старообрядцев в Беларуси в 1920–1930 гг. / С.А. Посталовский // Вести НАБ. – 2007. – № 4. – С. 51–56.

***Maroz I.M.*** **Old Believers of Bobruisk region (1944–1954)**

The article considers the place of old believers among other religious cults of Bobruisk region. The necessity of further study of the topic is indicated. On the basis of previously unpublished archival material the author compiled tables containing statistical data on communities. The main trends in the development of the network of the Old Believers' centers in Bobruisk region are highlighted.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 01.10.2014